іх унукам. Да тэкстаў ставіўся ашчадна, апавяданне вёў грунтоўна, з захаваннем паўтораў. Запісаная ад яго казка «Пра Вадавона Аўдонавіча і Аўдона Вадавонавіча» апублікавана ў томе «Казкі ў сучасных запісах» (1989).

*Літ.*: Беларускі эпас / Склад. С.І.Васілёнак, М.Я.Грынблат, К.П.Кабашнікаў. Мн., 1959; Беларускія казкі, запісаныя ад Пятра Гулевіча / Склад. П.Ахрыменка. Мн., 1963; Сацыяльна-бытавыя казкі / Склад. А.С.Фядосік. Мн., 1976; К а б а ш н і к а ў К.П. Казачнік Пётр Гулевіч // Бел. мова і літ. ў школе. 1990. №8.

*К. П. Кабашнікаў.*

**ГУЛЕ́ВІЧ** Станіслава Іосіфаўна (н. 25.5.1925, в. Рудня-Стаўбунская Веткаўскага р-на), спявачка (мецца-сапрана). Заслужаная артыстка Беларусі (1976). Скончыла Бел. кансерваторыю (1956). У 1946—48 спявала ў нар. хоры в. Рудня-Стаўбунская. З 1956 салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, у 1965—89 — Бел. філармоніі. Валодае голасам прыгожага цёплага тэмбру і шырокага дыяпазону, высокай вакальнай культурай. Адначасова з выкананнем оперных партый, камерных твораў і старадаўніх рамансаў, вылучалася натуральным і пранікнёным выкананнем бел. нар. песень, шмат з якіх сама збірала падчас канцэртавання па Беларусі: праграма «Песня сэрца майго». Выконвала бел. і інш. нар. песні ў суправаджэнні фартэпіяна, цымбалаў, сэкстэта домраў. У рэпертуары бел. нар. песні розных жанраў (вясельныя, купальскія, любоўныя, жартоўныя і інш.): «На дварэ дожджык», «Ой, пайду я лугам», «Шчабятала чачотачка», «Ой, ды зарадзілі сільна-буйна ягады ў бары», «А ў полі вярба» і інш. Запісы бел. нар. песень у яе выкананні захоўваюцца ў фондах Бел. радыё. Лаўрэат VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Масква, 1957).

*Літ.*: В а с і л е ў с к а я М. Песню родную люблю... // ЛіМ. 1983. №27.

*У. А. Васілевіч.*

**ГУЛЬНЁВА-КАРАГО́ДНЫЯ БАЛА́ДЫ**, гл. *Балады гульнёва-карагоднага складу.*

**ГУ́ЛЬНІ РО́ЛЕВЫЯ**, мадэліраванне рэальных ці выдуманых жыццёвых сітуацый, зносін, з'яў, заканамернасцей, супрацьлегласцей, дзе ўдзельнікам прапануецца выканаць якую-небудзь ролю ў пэўных абставінах. Гульня ідзе шляхам перайманння рэальных паводзін каго-небудзь і прадугледжвае пераўвасабленне чалавека і яго дзейнасць у пэўным вобразе. У Г.р. праяўляецца калектыўны і творчы характар дзейнасці, сітуацыйнасць. Праз Г.р. чалавек вучыцца разумець навакольны свет і спазнае яго, замацоўвае жыццёвыя назіранні, набывае ўменні і навыкі. Ролевыя паводзіны жорстка не вызначаны і дапускаюць пэўную свабоду дзеянняў у межах вызначанага сюжэта, а таксама прадугледжваюць не толькі яго выкананне, але і актыўную жыццёвую пазіцыю ўдзельніка ў выбары логікі паводзін. На аснове Г.р. пабудавана большасць нар. гульняў (гл. *Гульня народная*) з перавагай элементаў інтэрмедыі, імітацыі або з творчай выдумкай: «Пасу, пасу авечачкі», «Крук», «Пекла» і інш. Прынцыпы Г.р. прасочваюцца ў некаторых бел. абрадах каляндарнага (Каляды, Вялікдзень, Ваджэнне куста, Русальны тыдзень) і сямейна-абрадавага (Радзіны: паводзіны мужа ў час нараджэння дзіцяці, катанне бабы на баране, паводзіны кума і кумы і інш.) цыклаў. Элементы тэатралізацыі, выканання пэўнай ролі прысутнічаюць і ў шматлікіх каляндарных і сямейна-абрадавых гульнях, напрыклад, «На куццю», «Жаніцьба Цярэшкі», «Ваджэнне казы», «Рэдзька», «Свіння» і інш.

*Літ.:* С ы с о ў У.М. З крыніц спрадвечных. Мн., 1997; С т а р ж ы н с к а я Н.С.



*С. **Гулевіч** з цымбалістамі С. Навіцкім і Х. Шмелькіным.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ